

**ДАНІК-НАВУМЕНКА Ірына Мікалаеўна**
**(15.08.1949 г.)**

Нарадзілася ў в. Дзергілі (х.Станкі) Зэльвенскага раёна ў сям'і лесніка. Беларуская паэтка.

У 1956 годзе пайшла ў Дзергілёўскую 7-гадовую школу, працягвала вучыцца ў Булаўскай 8-гадовай школе. У 1967 годзе скончыла Міжэрыцкую сярэднюю школу Зэльвенскага раёна.

З 1968 года працавала токарам на Жданаўскім рамонтна-механічным заводзе Данецкай вобласці. Скончыла вячэрняе аддзяленне Жданоўскага індустрыяльнага тэхнікума, Маскоўскі народны ўніверсітэт мастацтваў (факультэт выяўленчага мастацтва), завочна Гродзенскае культасветвучылішча (1979 – 1982 гг.).

Пісала прозу - апавяданні, эсэ. Вершы пачала пісаць у 1975 годзе. Першы верш надрукавала ў 1977 годзе ў Зэльвенскай раённай газеце "Праца", дзе нейкі час працавала карэктарам, лінатыпістам, селькорам.

Друкавалася ў абласной газеце "Гродзенская праўда" ; рэспубліканскіх газетах: "Беларуская ніва", "ЛіМ", "Сельская газета"; часопісах "Маладосць", "Беларусь", "Полымя", "Работніца і сялянка"; калектыўных зборніках: "Краю мой – Нёман" (1986г.), "Каля Нёмана" (1994г.), "Бацька наш Нёман" (2001г.), "Галасы" (2002 – 2005гг.), "Наша Лорка" (2002г.), "Вітражы" (2006г.). Выдала зборнік вершаў "Мой светлы дзень" (2006г.) .

Яе паэтычныя творы гучалі на рэспубліканскім і абласным радыё і тэлебачанні. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

У 2006 годзе - член Гродзенскага абласнога аддзялення "Саюз пісьменнікаў Беларусі". У 2014 годзе пераможца літаратурнага конкурса "Гродна - культурная сталіца Беларусі 2014".

Памерла 27.10.2018 г.

## Бібліяграфія


1. **Беларуская паэтэса Данік Ірына Мікалаеўна** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://www.youtube.com/watch?v=NjV5KNH0Bvg. - Дата обращения: 25.11.2022.
2. **Данік, І. Вершы** / Ірына Данік // На нёманскай хвалі: літаратурны альманах. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2014. – № 4. — С. 36—39.
3. **Данік, І. Вершы** / Ірына Данік // На нёманскай хвалі: літаратурны альманах. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2010. – № 2. — С. 13—16.
4. **Данік, І. Каб бусел над зямлей ляцеў**: вершы / Ірына Данік // У прыгаршчах Айчыны: зборнік твораў гродзенскіх аўтараў. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2015. — С. 4—23.
5. **Данік, І. Мужнасць: урывак з паэмы** / Ірына Данік // На нёманскай хвалі: літаратурны альманах. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2012. – № 3. — С. 11—16.
6. **Данік Ірына Мікалаеўна // “Знакамітыя людзі Зэльвеншчыны – юбіляры 2019 года”**: інфармацыйна-краязнаўчы буклет. Выпуск 2 / ГУК “Зэльвенская раённая бібліятэка”; склад. С. В. Гецман. — Зэльва. — 2019. — С. 12—14. — (Серыя: “Краязнаўчы каляндар”).
7. **Данік-Навуменка, І. М. Мой светлы дзень:** вершы / Ірына Данік-Навуменка. – Гродна: Гродн. тип., 2006. — 98 с.
8. **Даник (Науменко) Ирина Николаевна, белорусская поэтесса** [Электронны рэсурс]. - Режим доступа: http://mostylib.by/base/?p=1213. - Дата доступа: 25.11.2022.
9. **Даник (Науменко) Ирина Николаевна, белорусская поэтесса** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: https://mostylib.by/base/?p=1213. - Дата обращения: 25.11.2022.
10. **Зэльвенскі зарапад** // Марціноўскі, П. М. Каб не пагаслі зоры: Артыкулы. Успаміны. Лісты. Вершы / Петр Марціноўскі. – Мінск: Ковчек, 2022. — С. 12—17.
11. **Ірына Данік** // Зоры над Зальвянкай: зборнік вершаў / Літ. аб’яд-не “Зоры над Зальвянкай”. — Слонім: Слонімская друкарня, 2008. — С. 30—36.
12. **Ірына Мікалаеўна Данік** [Электронный ресурс]. - Режим доступа: http://pisateli.by/2018/116.pdf. - Дата обращения: 25.11.2022.
13. **Марціноўскі, П. “Ад Стральцоў да Зэльвы недалека…”** / Петр Марціноўскі // Праца. – 1996. – 5 сакавіка. — С. 2. — (Серыя: “Твае людзі, Зэльвеншчына”).
14. **Навуменка ірына Мікалаеўна** // Памяць. Зэльвенскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэдкал.: У. С. Богаў, Т. П. Броска, І. І. Васілеўка і інш. ; Уклад. Т. П. Броска ; Маст. Э. Э. Жакевіч. — Мінск: Паліграфафармленне, 2003. — С. 421.
15. **Попка, Л. Прызналася ў любові Гродна** / Людміла Попка // Праца. – 2015. — 10 студзеня. — С. 1; 9.

16. **Попка, Л. Скарб бясцэнны - душа паэта** / Людміла Попка // Праца. - 2009. — 21 кастрычніка. — С. 5.
17. **Шматко, Я. Два паэтычныя лесы** / Яніна Шматко // Праца. – 2016. – 27 ліпеня. – С. 4.
18. **Шматко, Я. “Заране” – юбіляры года** / Яніна Шматко // Праца. – 2009. – 6 чэрвеня. — С. 8. — (Серыя: “Зоры над Зальвянкай”).
19. **Шматко, Я. Скарб бясцэнны - душа паэта** / Яніна Шматко // Праца. - 2009. — 21 кастрычніка. — С. 5.